УДК 94(476)+323“1914” А. Ф. Гірс

**В. А. Міхедзька**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# БЕЛАРУСЫ Ў АНТЫПОЛЬСКАЙ ПРАГРАМЕ МІНСКАГА ГУБЕРНАТАРА А. Ф. ГІРСА

*У артыкуле разгледжаны асноўныя тэзісы праграмы антыпаланізацыйных дзеянняў, прапанаванай у пачатку 1914 г. мінскім губернатарам А.Ф. Гірсам. Мэтай праграмы дэкларавалася ўмацаванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, у якасці сродка яе дасягнення прапаноўваліся антыпольскія захады у адукацыйнай, эканамічнай і рэлігійнай сферах.*

Разняволенне грамадска-палітычнага жыцця і адмена значнай часткі “абмежавальнага заканадаўства” у аграрнай сферы пасля выдання маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. паставілі расійскую ўладу ў “Паўночна-Заходнім краі” перад новай хваляй “польскай пагрозы”.

Несуцяшальныя для “русского дела в Северо-Западном крае” тэндэнцыі падштурхоўвалі да пошукаў супрацьдзеяння, адлюстраваннем якіх сталася распрацаваная мінскім губернатарам А. Ф. Гірсам “Докладная записка о мерах, могущих укрепить национальное самосознание белоруссов и противодействовать их полонизации” [1]. Аляксей Фёдаравіч Гірс быў дастаткова добра абазнаны ў рэаліях “заходніх ускраін”. На працягу трох гадоў (1906–1908) быў віцэ–губернатарам Эстляндскай губерні, пасля паслядоўна займаў пасады кіеўскага (1908–1911) і мінскага (1912–1915) губернатара. “Докладная записка”, падрыхтаваная А. Ф. Гірсам, у студзені 1914 г. была раздрукавана асобнай брашурай аб’ёмам у 25 старонак. Тэкст асобніка брашуры пад грыфам “зусім сакрэтна”, які быў прызначаны мінскаму губернскаму маршалку А.С. Далгаво-Сабураву, захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, і з разгорнутым каментарам быў апублікаваны Р. Юркоўскім [2; 3]. “Докладная записка” была накіравана А.Ф. Гірсам у Савет міністраў Расійскай імперыі [4, с. 301]. Такім чынам А.Ф. Гірс спрабаваў ініцыяваць ўзмацненне антыпольскіх захадаў ва ўрадавым курсе на тэрыторыі “Заходняга края”. На момант стварэння гэтага дакумента губернскія ўлады, ў межах сваіх паўнамоцтваў, а часам і па-за імі, ўжо ажыццявілі шэраг самастойных крокаў па абмежаванні польскай прысутнасці ў грамадскім і культурным жыцці Мінскай губерні. Але такой самадзейнай актыўнасці губернскіх уладаў “заходняга края”, як адзначаў А. Ф.Гірс, відавочна, было зусім недастаткова. Р. Юркоўскі звязвае падачу “Докладной запіскі” менавіта з тым негатыўным розгаласам, які атрымалі ў Дзяржаўнай Думе Расійскай імперыі практычныя антыпольскія захады мінскай губернскай адміністрацыі [2, s. 585].

Варта заўважыць, што “Докладная записка” А. Ф. Гірса з’яўляецца ці не першым падпісаным губернатарам губерні “Паўночна-Заходнягя края” дакументам, які мае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

загалоўкам “нацыянальнае самаўсведамленне беларусаў”. Да гэтага часу “беларускае пытанне” ў справаздачах губернатараў і генерал–губернатараў згадвалася толькі ў кантэксце агульнай этнаканфесійнай сітуацыі ў краі і ніколі не вылучалася у асобную праблематыку. “Падобныя тэрміналагічныя змены магчыма патлумачыць рэакцыяй на ўзмацненне беларускага нацыянальнага руху. Знаёмства з тэкстам паказвае, аднак, што А. Ф. Гірс быў далёкі ад прызнання беларусаў самастойнай этнічнай супольнасцю. Гэты дакумент, у якім змешчаны заўвагі аб нацыянальна-рэлігійным становішчы ў краі і прапановы па ўмацаванні расійскіх пазіцый, выразна адлюстроўвае сістэму поглядаў і псіхалогію мясцовых расійскіх адміністратараў.

“Запіска” А.Ф. Гірса пачынаецца прызнаннем вызначальнай ролі М. М. Мураўёва ў стварэнні ўмоў для “паступальнага ходу рускіх пачаткаў і развіцця рускай культуры ў краі за кошт польскай”. Гэтыя ўмовы забяспечылі “русское дело” і паступовае выцісненне польскай культуры. Аднак з 1905–1906 гг. адзначаны ўжо рух у адваротным кірунку. Мінскі губернатар падкрэсліваў, што ўрад, адмяніўшы абмежавальныя законы ў сферы набыцця зямельнай уласнасці і культурна-рэлігійнага жыцця, моцна памыліўся ў сваім разліку на моц “рускага элементу” ў краі. Насамрэч, на думку губернатара, “рускі элемент у краі яшчэ недастаткова ўмацаваўся, каб уласнымі сіламі абараніць край для Расіі і для рускай культуры” [1, c.1]. А. Ф. Гірс адзначаў: “як толькі зняты былі забароны… неадкладна ж выявілася перавага польскай меншасці і ў культурных і эканамічных адносінах і недастатковая падрыхтаванасць рускай большасці для процідзеяння польскай гегемоніі ў краі. Польскае жыццё … пачала прыкметна браць верх над рускім жыццём…” [1, c. 13]. Адзіным спосабам захаваць край для Расіі было не толькі вяртанне папярэдніх абмежавальных законаў, але ўвядзенне новых абмежаванняў, якія павінны былі спыніць “паступальны рух каталіцтва і паланізацыі”. Адначасова, заўважаў аўтар, неабходна было ажыццявіць шэраг мерапрыемстваў па ўмацаванні “рускага элементу”, каб у будучыні ён быў здольны самастойна супрацьстаяць “націску паланізму”. Гэтыя захады ён падзяліў на дзве групы – абмежавальныя, ці “охранительные” мерапрыемствы, якія мусілі спыніць наступ польскай культуры і “стваральныя”, якія павінны былі спрыяць развіццю “рускіх пачаткаў” у краі насуперак польскім.

Пералік і абгрунтаванне неабходных ахоўных мерапрыемстваў А. Ф. Гірс пачаў з азначэння “самага цяжкага ўдару для рускай справы ў краі”. Такім ён лічыў адмену жорсткіх грашовых і адміністратыўных пакаранняў за арганізацыю тайных польскіх школ. На думку губернатара, тым самым урад стварыў шырокія магчымасці для беспакаранай паланізацыйнай дзейнасці. Па прызнанні губернатара, не маючы іншых сродкаў спыніць дзейнасць недазволеных польскіх школак, папярэдні мінскі губернатар Я. Я. Эрдэлі яшчэ ў 1911 г. прыняў уласныя “абавязковыя пастановы”, якія значна павялічвалі пакаранні нават у параўнанні з ранейшай заканадаўчай нормай [1, c. 2]. А. Ф. Гірс настойліва пераконваў у неабходнасці вяртання заканадаўчай забароны польскай адукацыі ў краі. Моцнай перашкодай на шляху пашырэння польскай асветы ў краі мусілі стаць пачатковыя рускія школы і настаўніцкія семінарыі. На гэтыя навучальныя установы, падкрэсліваў губернатар, “неабходна глядзець … як на адзіны пакуль шлях далучэння найбольш здольных прадстаўнікоў беларускага племені да рускай культуры” [1, c. 15]. Падмуркам гэтаму павінна было стаць выкладанне гісторыі, “асабліва мясцовай”, геаграфіі Расіі і рускай літаратуры, таму што – “мінулае Беларусі ўяўляе сабою багаты матэрыял для выхавання рускага патрыятычнага пачуцця, для выхавання любові і адданасці да Расіі і рускіх самадзержцаў, якія выратавалі беларускае племя ад канчатковага паглынання яго палякамі” [1, c. 16].

Ідучы насуперак працяглай традыцыі паблажліва-грэблівага стаўлення да беларускага люду, якая усталявалася ў расійскай грамадскай думцы, А. Ф. Гірс аптымістычна характаразаваў перспектывы выкарыстання “багатага і ўдзячнага этнаграфічнага матэрыялу, якім з’яўляецца беларускае племя. Багата адоранае ад прыроды, незвычайна працавітае,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цвярозае, несумненна адданае Расіі…” Але “белоруссы” мінскага губернатара – толькі сінонім назвы мясцовага рускага насельніцтва, несумненная, хаця ж і занядбаная, з няўстойлівай ідэнтычнасцю, частка рускага народу. Для А. Ф. Гірса ўжо не існавала сумненняў, што і беларусы каталіцкага вызнання мелі “рускае”, а не польскае паходжанне. Таму натуральна, што адукацыя беларусаў–католікаў, перад усім рэлігійнае навучанне, павінна адбывацца “на іх прыроднай мове” – гэта значыць на рускай, таксама як права вучыцца па-польску атрымалі палякі, а па-літоўску – літоўцы [1, с. 7].

Рэлігійнае жыццё “Паўночна-Заходнягя края” разглядалася расійскай адміністрацыяй і дзяржаўнай праваслаўнай царквой, а разам з тым і іерархіяй царквы каталіцкай як поле цывілізацыйнага змагання. А. Ф. Гірс адзначаў ўздым паланізацыйнай дзейнасці сярод беларускага насельніцтва з боку мясцовых біскупаў–палякаў і каталіцкіх семінарый, пашырэнне каталіцкага празелітызма, якое адбывалася пасля выдання указа 17 красавіка 1905 г. Ён адзначыў моцны паланізацыйны эфект дзейнасці каталіцкіх семінарый, дзе з навучэнцаў–беларусаў выхоўваліся ксяндзы, адданыя польскай нацыянальнай справе, а таксама моцны ўплыў на вернікаў–беларусаў з боку каталіцкіх біскупаў–палякаў. У гэтым кантэксце мінскі губернатар вяртаўся да напаўзабытай ідэі неабходнасці “распалячвання” каталіцкай царквы ў “Паўночна-Заходнім краі” і заклікаў увесці на тэрыторыі края адпаведныя абмежаванні на прысутнасць этнічных палякаў у касцёльных структурах. Адначасова ў гэтым жа кірунку сярод важнейшых “стваральных” мерапрыемстваў мінскі губернатар называў дапамогу, перш за ўсё фінансавую, праваслаўнай царкве і праваслаўным брацтвам, якія “маглі б саслужыць незаменную службу рускаму народу і рускай дзяржаве ў справе барацьбы з каталіцызмам і паланізацыяй”. Асабліва мінскі губернатар спыніўся на неабходнасці пабудовы ў старажытным Тураве храма ў гонар святых Кірылы і Лаўрэнція, епіскапаў Тураўскіх. Заслугі тураўскага епіскапа Лаўрэнція, які жыў і памёр у XII ст., А. Ф. Гірс тлумачыў тым, што і на яго долю прыпала “крывавая барацьба з езуітамі і абарона прыгнечаных аднаверцаў ад падначалення Папе” [1, с. 17–19, 23–24].

Побач з поспехамі польскай адукацыі і паланізацыйнымі працэсамі ў рэлігійным жыцці ў пераліку галоўных пагроз А. Ф. Гірс пазначаў адмену забароны “асобам польскага паходжання” набываць зямельную ўласнасць ў Заходнім краі: “польскае землеўладанне ў краі – гэта крыніца, з якой сілкуюцца і польскі касцёл, і польска-каталіцкая прапаганда … і ўсе культурна-польскія прадпрыемствы ў краі, і ўся тая сума старашляхецкай нянавісці да Расіі і да ўсяго рускага, з якою ўраду даводзілася лічыцца ў мінулым, даводзіцца лічыцца ў сучаснасці і прыйдзецца лічыцца ў будучыні…” [1, с. 13]. Таму польскаму землеўладанню неабходна супрацьпаставіць не толькі жорсткі кантроль з боку ўлады, але, што больш важна – рускае землеўладанне. Пры гэтым, адзначыўшы пажаданасць пашырэння “рускага” сялянскага землеўладання ў краі, А. Ф. Гірс скептычна ставіўся да магчымасці выкарыстаць у барацьбе з “паланізмам” беларускае сялянства: “культурным польскім сілам неабходна супрацьпаставіць роўныя культурныя рускія сілы”. Але мясцовыя расійскія дваране– землеўласнікі ў перспектыве не маглі стварыць неабходнай апоры ўладам, як было слушна заўважана, “разлічваць, што сілы гэтыя можа даць рускае дваранства, нельга… нават у цэнтры Расіі дваранскае землеўладанне пачынае ісці да заняпаду”. Таму патрэбна не толькі абапірацца на прышлае рускае чынавенства, але “звярнуцца …да мясцовых рускіх культурных сіл недваранскага паходжання, ... да той мясцовай рускай інтэлігенцыі, якая вылучана мясцовым беларускім насельніцтвам, дзякуючы паўвекавой дзейнасці тут рускай школы. Гэта інтэлігенцыя … найбольш прыдатная для стварэння з яе рускіх культурных землеўладальнікаў…” [1, с. 14]. Аднак на шляху з’яўлення “культурных землеўласнікаў” існавалі значныя перашкоды: “недахоп рускіх людзей з агранамічнымі ведамі і адначасова знаёмых з умовамі мясцовай сельскай гаспадаркі надта згубна ўплывае на развіццё ў краі рускага землеўладання, ператвараючы яго частакроць у фікцыю”. Як заўважаў губернатар, агранамічныя веды пашыраліся ў краі двума шляхамі – з аднаго боку праз ўрадавых

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аграномаў і інструктараў, а з іншага боку праз мясцовыя сельскагаспадарчыя таварыствы, якія былі “цалкам у руках палякаў”. Таму для спрыяння рускім землеўладальнікам А. Ф. Гірс прапаноўваў стварыць ў Мінску сельскагаспадарчы інстытут [1, с. 21]. Мінскі губернатар звяртаў увагу і на іншую крыніцу росту эканамічнай і грамадскай вагі польскай грамады – яе удзел у гарадскім самакіраванні. Вялікія фінансавыя магчымасці і адносная самастойнасць органаў гарадскога самакіравання ад губернатарскай улады уяўляліся А. Ф. Гірсу вельмі небяспечным фактарам “пашырэння паланізму” і змяншэння аўтарытэту ўлады. Антыпаланізацыйная дзейнасць мінскага губернатара ў сферы гарадскога грамадскага і культурнага жыцця часам набывала, аднак, не проста спрэчныя, але і скандальна-фарсавыя формы. Так, з трыбуны Дзяржаўнай Думы была прадэманстравана праграма аматарскай тэатральнай пастаноўкі “Пана Тадэвуша”, у якой, на патрабаванне мінскай губернскай адміністрацыі назва спектакля была перакладзеная на рускую мову і гучала “Господин Фаддей” [5, с. 275].

Такім чынам, прапанаваныя А. Ф. Гірсам захады па ўмацаванні “нацыянальнага самаўсведамлення беларусаў” не выходзілі за межы, вызначаныя калісьці яшчэ М. Мураўёвым. Аднак менавіта абгрунтаванне неабходнасці больш маштабнага і мэтанакіраванага выкарыстання ў барацьбе з “паланізмам” беларускага насельніцтва з’яўляецца істотным момантам праекта А. Ф. Гірса. Мінскі губернатар перайшоў у сваіх прапановах ад “магчымасці” да адзначэння неабходнасці “выкарыстання ў дзяржаўных мэтах беларускага этнаграфічнага матэрыялу”. Пры тым, што вызначэнне “беларусы” вынесена ў назву запіскі А. Ф. Гірса, іх прысутнасць у тэксце не надта праяўляецца пасярод пастаянных згадак пра “рускія пачаткі”, “рускія асновы” і “рускую культуру” ў краі і яшчэ больш незаўважная на тле шматлікіх згадак палякаў. Беларусы у яго разважаннях – ня вельмі ўпэўненая ў сваёй ідэнтычнасці частка рускага народу. У прапановах А. Ф. Гірса беларусы былі не толькі аб’ектам ахоўных урадавых мерапрыемстваў, але павінны былі стацца іх асноўным рухавіком і непасрэдным выканаўцам. Гаворачы аб умацаванні нацыянальнай самасвядомасці “белоруссов”, мінскі губернатар А. Ф. Гірс меў на ўвазе не ўмацаванне культурнай самабытнасці мясцовага беларускага насельніцтва, але яго русіфікацыю.

**Крыніцы і літаратура**

1. Докладная записка “О мерах, могущих укрепить национальное самосознание белоруссов и противодействовать их полонизации” минского губернатора Гирса // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 60. – Вп. 3. – Спр. 114.

2. Jurkowski, R. “O sposobach majacVch wzmocnić świadomość narodową Białorusinów i przeciwdziałać ich polonizacji”: tajnV memoriał mińskiego gubernatora Aleksieja Girsa o politVce rosVjskiej wobec Białorusinów i Polaków w przededniu I wojnV światowej : część I / R. Jurkowski // Przegląd Wschodnioeuropejski. – 2013. – № 4. – S. 581–617.

3. Jurkowski, R. “O sposobach majacVch wzmocnić świadomość narodową Białorusinów i przeciwdziałać ich polonizacji”: tajnV memoriał mińskiego gubernatora Aleksieja Girsa o politVce rosVjskiej wobec Białorusinów i Polaków w przededniu I wojnV światowej : część I / R. Jurkowski // Przegląd Wschodnioeuropejski. – 2014. – № 5/1. – S. 302–321.

4. Унучак, А. Расійская нацыянальная палітыка на землях былога ВКЛ: “Польскае пытанне” і беларуская ідэя 1863–1914 гг. / А. Унучак // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі : У гонар прафесара Эльжбеты Смулковай : зб. арт. / пад рэд. І. Э. Багдановіч, М. І. Свістуновай. – Мінск : БДУ, 2016. – С. 298–317.

5. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – Спб. :Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ